РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 студзеня 2025 г. СЕРАДА № 8 (30396)



## «ГАЛОЎНАЕ ПАТРАБАВАННЕ — ВЫКАНАЛЬНІЦКАЯ ДЫСЦЫПЛІНА І АДКАЗНАСЦЬ ЗА РАШЭННІ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЦА»

У кадравы дзень Прэзідэнт, як заўсёды, гаварыў аб важным для ўсіх

(Падрабязнасці на стар. 2-3)

## НЕ РАЗБУРАЦЬ, А РЭГІСТРАВАЦЬ

«Будаўнічую амністыю» падоўжылі

**Днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 10 аб падаўжэнні «будаўнічай амністыі» на тры гады.**

Згодна з гэтым дакументам, спрошчаны парадак прыёмкі ў эксплуатацыю аднакватэрных жылых дамоў і нежылых пабудоў, якія былі ўзведзены без дазволаў і праектнай дакументацыі, будзе дзейнічаць да 1 студзеня 2028-га. Выключэнне складаюць аб'екты, размешчаныя ў Мінску.

Цяпер грамадзяне, якія пабудавалі такія аб'екты на зямельных участках, атрыманых да 1 верасня 2022 года, змогуць падаць заявы на іх узаконьванне. Мясцовыя органы ўлады атрымалі права прымаць гэтыя пабудовы ў эксплуатацыю, не прызнаючы іх самавольнымі.

Гэтым дакументам унесены змяненні ва Указ Прэзідэнта Беларусі ад 25 ліпеня 2022 года № 253 «Аб спрошчаным парадку прыёмкі ў эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва», адзначыла **начальнік Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры Таццяна ВАСІЛЮЧАК:** «Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам дадзена права прымаць у эксплуатацыю аднакватэрныя жылыя дамы і нежылыя пабудовы пры адпаведнасці іх пятаму класу складанасці, захаванні патрабаванняў па размяшчэнні ў межах выдзеленага зямельнага ўчастка і адпаведнасці гатоўнасці аб'екта да эксплуатацыі. Прыёмка ў эксплуатацыю такіх аб'ектаў будаўніцтва будзе ажыццяўляцца на падставе заявы і ведамасці тэхнічных характарыстык. Заявы могуць быць пададзеныя грамадзянамі да 1 студзеня 2028 года».

СТАР. 4–5




«ДАЖЫНКІ» ПЕРАЕДУЦЬ У АГРАГАРАДКІ



БАЛЬ ПАПЯЛУШКІ Ў ВЯЛІКІМ

16



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

## БУДУЧЫНЯ НАВУКІ

12 маладых вучоных прызналі найлепшымі

Падтрымка навуковай моладзі — абавязковая ўмова развіцця навукі. У 2019 годзе былі зацверджаны прэміі для таленавітых маладых навукоўцаў, якія працуюць у інстытутах і даследчых цэнтрах Нацыянальнай акадэміі навук. Дзве з іх штогод прысуджаюцца ў галіне фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, тэхнічных навук (яны носяць імя акадэміка Ж. І. Алфёрава). Чатыры (імя акадэміка В. Ф. Купрэвіча) — уручаюцца за найлепшыя распрацоўкі ў галіне біялогіі, хіміі, медыцыны, аграрных навук. І яшчэ дзве — імя акадэміка У. М. Ігнатоўскага — заснаваны ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук.



Яўгенія ЗЯНОЎКА і Віталь ХАХЛОЎ падчас уручэння прэміі імя Ж. Алфёрава для таленавітых маладых навукоўцаў.

СТАР. 14

ISSN 1990 — 763X

# «ПАВІННЫ БЫЦЬ ЦВЁРДЫЯ І ВЫКАНАЛЬНІЦКАЯ ДЫСЦЫПЛІНА.

## Новыя міністры і нечаканыя ратацыі ў пасольствах.

**Першы ў 2025 годзе кадравы дзень прайшоў у Палацы Незалежнасці. Ён адзначыўся гучнымі, у чымсьці нечаканымі, важнымі прызначэннямі. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў новых кіраўнікоў дыпламатычных місій і міністраў. І, па традыцыі кадравых дзён, кіраўнік дзяржавы паставіў перад прызначэнцамі ключавыя задачы, якія ім трэба будзе выконваць на новых пасадах.**

Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей Багданаў прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Казахстане. Павел Уцюпін, які займаў раней гэту пасаду, стаў намеснікам міністра замежных спраў, змяніўшы на гэтай пасадзе Ігара Назарука, які прызначаны пастаянным паўнамоцным прадстаўніком Беларусі пры статутных і іншых органах СНД. Першы намеснік міністра прамысловасці Аляксандр Агароднікаў узначаліў беларускую місію ва Узбекістане. А Дзмітрый Піневіч, у мінулым міністр аховы здароўя, назначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Азербайджане. Віталь Барчук, начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічных сувязяў Міністэрства прамысловасці, заняў пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Кубе і па сумяшчальніцтве ў Дамінікане і Нікарагуа.

Адбыліся змены ў кадравым складзе Міністэрства замежных спраў. Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі галоўнага інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення МЗС Анатоль Глаз накіраваны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Турцыі. Начальнік службы дзяржаўнага пратакола МЗС Юрый Ярашэвіч прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Ізраілі.



Фота БелТА.

«Максім Уладзіміравіч, я так разумею, вы пазбаўляецеся ад непатрэбных людзей. Хоць як яны могуць быць непатрэбнымі?» — спытаў Прэзідэнт у міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова. Той адказаў, што ні ў якім разе не пазбаўляецца. «Наадварот, тыя кірункі, якія сёння важныя для нашай краіны, стараюся ўмацаваць найбольш падрыхтаванымі кадрамі, для якіх гэта прызначэнне будзе крокам наперад», — адказаў міністр. Па яго словах, у Турцыі, Ізраілі, краінах СНД, на Кубе патрэбны вельмі адукаваныя, вельмі падрыхтаваныя спецыялісты. Максім Рыжанкоў таксама адзначыў, што на вакантныя месцы, якія з'явіліся ў міністэрстве, ужо ёсць кандыдатуры.

«Па Міністэрстве прамысловасці ў нас што, добра ўсё, што мы перспектыўных наместнікаў адпраўляем?» — спытаў беларускі лідар ужо ў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што на сёння мінпрам усе заданні выконвае, рэалізоўвае інавацыйныя праекты. «Ваша даручэнне было, што акрамя двух кітоў па нашым знешнім гандлі — Расіі і Кітая — мы павінны ўмацаваць адносіны з краінамі СНД. З іх выдзяляецца вялікая тройка: Казахстан, Азербайджан і Узбекістан», — адзначыў Дзмітрый Крутой.

### ТРЭБА ЎСТАНАЎЛІВАЦЬ АДНОСІНЫ З КАНКРЭТНЫМІ ЛЮДЗЬМІ

**«Усе людзі вядомыя, нікому не закрыта дарога ў жыцці. Усё будзе залежаць ад гэтага этапу вашай працы.** Усіх, якія сядзяць за гэтым сталом», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пацікавіўся ў новых паслоў, якімі яны бачаць сваю будучую працу, мэты і задачы. «Стаўлю перад сабой задачу, вядома, павялічыць экспарт беларускай прадукцыі, перавысіць яго ў адзін мільярд долараў. У 2021 годзе наш тавараабарот дасягнуў 1 мільярда долараў, сёння складае 1,2 мільярда. Але экспарт пакуль у нас завіс ад лічбы 800—900 мільёнаў. Таму дадаць у гэтым кірунку», — адказаў Аляксей Багданаў, які ўзначаліў дыпмісію Беларусі ў Казахстане. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, за кошт чаго пасол плануе павялічыць экспарт. Найперш Аляксей Багданаў назваў сумесныя вытворчасці «Гомсельмаша», Мінскага трактарнага завода, МАЗа, «Магілёўліфтмаша», «Бабруйскаграмаша», якія ўжо працуюць у Казахстане.

«Нам неабходна павялічваць пастаўкі беларускіх прадуктаў харчавання. Будзем працаваць па павелічэнні паставак менавіта халяльнай прадукцыі, — заявіў дыпламат. — І, вядома, палітыка, культура, спорт — ніхто не адмяняў гэту работу. Неабходна будзе працаваць па ўсіх кірунках».

Дзмітрый Крутой, у сваю чаргу, заўважыў, што ў супрацоўніцтве з Казахстанам вялікі рэзерв у рэгіёнах. «Па прыкладзе Расіі з кіраўнікамі казахскіх рэгіёнаў мы павінны працаваць сапраўды гэтак жа», — адзначыў ён.

«Казахстан усё купіць у нас, калі гэта будзе праходзіць па цане і якасці. Асабліва якасць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што рынкам Казахстана зацікаўлены не толькі Беларусь і Расія, там прысутнічаюць і заходнія краіны, і Кітай. **«Таму шлях наш толькі праз рэгіёны. Трэба ўстанаўліваць адносіны з канкрэтнымі людзьмі і кіраўнікамі на месцах»**, — паставіў задачу Прэзідэнт.

Тое самае, па яго словах, датычыцца і Узбекістана. «З прэзідэнтам Мірзіёевым у нас больш чым добрыя адносіны. Яны малайцы, усяляк нас падтрымліваюць, дапамагаюць і ў гэты санкцыйны перыяд. Але трэба з імі працаваць. Упэўнены, што там вялікае поле дзейнасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**У тэму**

## Найбліжэйшая пяцігодка будзе вельмі адказнай для дыпламатыі

Падрабязна пра свае планы паслы расказалі журналістам. Па словах **Анатоля Глаза**, на першым месцы ў рабоце пасла, канешне, эканоміка. Але не менш важная гуманітарная сфера, адукацыя, навука, культура. «Пасол прадстаўляе сваю краіну, Прэзідэнта сваёй краіны і займаецца ўсім спектрам пытанняў. У найбліжэйшыя пяць гадоў, а можа, і 10, у свеце дыпламатыя, паводле ўсіх прагнозаў, будзе мець вялікае значэнне. Вы бачыце тэктанічныя зрухі, якія адбываюцца, і камусьці ў выніку давядзецца ўсё гэта фіксаваць. Таму найбліжэйшая пяцігодка будзе вельмі адказнай для дыпламатыі», — сказаў ён.

### Турцыя. Патэнцыял канвертаваць у выніці

Штодатычыцца непасрэдна супрацоўніцтва з Турцыяй, то Анатоль Глаз звярнуў увагу: гэты сур'ёзны гулец у геапалітычным кантэксце вельмі важны для нашай краіны. «Нашы адносіны з Турцыяй ахопліваюць усе сферы. Так, адносіны з Турцыяй добрыя. Але стаіць задача іх добры патэнцыял канвертаваць у вялікую рэзультатыўнасць. Вынікі ўжо ёсць. Самае галоўнае, што ёсць узаемны інтарэс іх палепшыць, — сказаў пасол. — У нас цудоўны кантакт. У кіраўнікоў дзяржаў ёсць выдатныя дамоўленасці. Але вось не хапае паловы кроку. Я мяркую, што мы знойдзем спосаб зрабіць гэтыя паўкрока і вывесці нашы адносіны на больш якасны ўзровень».

### Ізраіль. Не грэбаваць гістарычнай памяццю

**Пасол Беларусі ў Ізраілі Юрый Ярашэвіч** здзейсніў невялікі гістарычны экскурс. «Я думаю, што гэта нацыя ніколі не забудзе, нягледзячы на палітычныя турбулентнасці, пра тое, што прыкладна з XIV стагоддзя яўрэі дастаткова ўтульна, камфортна і бяспечна жылі на тэрыторыі Беларусі», — сказаў ён. Юрый Ярашэвіч звярнуў увагу, што нават трагічнае для яўрэяў XX стагоддзе паказала чалавечыя, братэрскія адносіны беларусаў і яўрэяў. Жыхары нашай краіны гераічна, часам цаной свайго жыцця ратавалі яўрэяў у час Вялікай Айчыннай вайны. «Гэтыя рэчы, мяркую, у Тэль-Авіве ці Іерусаліме трэба асвяжыць. Беларусь заўсёды з'яўлялася не на словах, а на справе той зямлёй, дзе яўрэям было добра. Такія рэчы нельга забываць: ні чалавечна, ні гістарычна, ні палітычна», — адзначыў пасол.

За мінулы год тавараабарот паміж Беларуссю і Ізраілем складзецца на ўзроўні 170—180 мільёнаў долараў. Цікава, што структура беларускага экспарту досыць разнастайная: металапракат, рапсавы алей, марожанае, рыба. Таму, па словах пасла, ключоў да супрацоўніцтва шмат. Тым больш што сітуацыя ў рэгіёне складваецца такім чынам, што беларускі экспарт становіцца ўсё больш запатрабаваным у Ізраілі.

### Казахстан. Узмацняць міжрэгіянальнае ўзаемадзеянне

Сёння Казахстан займае другое месца сярод краін СНД па экспарце беларускай прадукцыі, уваходзіць у дзясятку пакупнікоў нашай прадукцыі сярод краін свету. Патэнцыял для развіцця адносін сапраўды вялікі. **Пасол Беларусі ў Казахстане Аляксей Багданаў** адзначыў, што для развіцця міжрэгіянальнага супрацоўніцтва дзвюх краін трэба прыкласці шмат намаганняў. «Магчыма, мы створым фармат работы накшталт форуму рэгіёнаў, які ёсць з Расіяй. Такую прапанову будзем уносіць кіраўніцтву Казахстана. Мы бачым станоўчы эфект ад рэгіянальнага ўзаемадзеяння з Расіяй. Вядома, з брацкай рэспублікай Казахстан сам бог загадаў узмацняць гэтае ўзаемадзеянне, — сказаў ён. — Вядома, сёння нашым краінам вельмі складана выязджаць, нас імкнуцца раз'яднаць і адарваць адну ад адной. Таму задача ў тым, каб захаваць культурнае гістарычнае ўзаемадзеянне і на базе моцных сувязяў павялічыць тавараабарот».

### Азербайджан. Стварыць кругаварот, які закранае ўсе пункты

**Дзмітрый Піневіч** падкрэсліў, што цяпер кропкі росту супрацоўніцтва Беларусі і Азербайджана ляжаць у тым ліку ў гуманітарнай сферы. «У нейкай ступені гэта мае дачыненне да таго, што адносіны... даўгі, узаемадзеянне ў сферы аховы здароўя, фармацэўтычнай прамысловасці, а каля яе знаходзіцца біялагічная прамысловасць. IT-тэхналогіі мы можам прапанаваць на больш высокім узроўні. З гэтым звязаны адукацыйныя праграмы. І гэта дае імпульс міжкультурным сувязям. Калі мы створым такі кругаварот, які закранае ўсе пункты судакранання, то атрымаем станоўчы эфект», — пераканаы Дзмітрый Піневіч. Ён падкрэсліў, што Азербайджан — гэта індустрыяльна развітая краіна. І ў кожнай галіне прамысловасці, у сацыяльнай сферы яны маюць дасягненні, якія, як і беларускія поспехі, павінны ўзаемаўзбагачацца. Гэта дае магчымасць планаваць сумесныя праекты, сумесныя вытворчасці. «Наша задача ў тым, каб ментальная сувязь атрымала ўстойлівае эканамічнае ўзаемадзеянне. Мы павінны глядзець не проста ў заўтра, а ў паслязаўтра», — канстатаваў Дзмітрый Піневіч.

# ПАТРАБАВАННІ ГЭТА ДАТЫЧЫЦЦА ЎСІХ»

## Падрабязнасці кадравага панядзелка ў Палацы Незалежнасці



Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Азербайджан — таксама добры сябар Беларусі, як і прэзідэнт гэтай краіны ІльхамАліеў. Таму, па словах Аляксандра Лукашэнкі, любая прапанова беларускага пасла Дзмітрыя Піневіча будзе падтрымана, паколькі ў Азербайджане Беларусь вельмі добра ведаюць і любяць. Па словах беларускага лідара, у краінах СНД нашу краіну паважаюць. Таму паслам там будзе працаваць камфортна.

«Ярашэвічу працаваць у Ізраілі няпроста будзе. Але калі ён знойдзе правільную дарогу, з Ізраілем у нас таксама будуць добрыя адносіны. Там ёсць тыя, хто не хацеў бы выбудоўваць з намі адносіны. Але большасць людзей цэняць і паважаюць Беларусь. І нашых жа там дастаткова, якія ў свой час з'ехалі, іх дзеці», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Што датычыцца адносін з Турцыяй, то, па словах Прэзідэнта, іх узровень трэба павышаць. «З прэзідэнтам Турцыі ў нас быў прамы дыялог і дамоўленасць: мы робім гэта — ён робіць гэта, мы гэты крок — ён гэты крок. Пакуль мы гэтых крокаў не бачым. Яны не ідуць, бо мы гэтым не займаемся шчыльна. Таму, Анатоль, табе трэба будзе ўдзяліць гэтаму ўвагу, — сказаў кіраўнік дзяржавы паслу Беларусі ў Турцыі Анатолю Глазу. — І пры сустрэчы з прэзідэнтам Эрдаганам падчас кароткай цырымоніі ўручэння грамат трэба шчыра сказаць, што мы вельмі цэнім адносіны з Турцыяй, для нас яны вельмі важныя і мы чакаем ад іх крокаў. Бо мы зрабілі ўсё, што абяцалі».



Фота БелТА.

### БЯЗДУМНАГА БЫЦЬ НЕ ПАВІННА

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што ў гэтай пяцігодцы і сёлета галоўнае патрабаванне да Міністэрства замежных спраў, як і ўсіх дзяржаўных служачых, — выканальніцкая дысцыпліна і адказнасць за рашэнні, якія прымаюцца. «Наводзьце парадак у МЗС, жалезнае патрабаванне — без усялякай дурноты. Людзі адукаваныя, разумныя, дыпламатаў неразумных няма... **Павінны быць цвёрдыя патрабаванні, там, дзе яны патрэбны, і выканальніцкая дысцыпліна з боку падначаленых. Гэта датычыцца ўсіх. Ніякай размазні быць не павінна. Ні ў Адміністрацыі, ні ва ўрадзе. Ні ў вас. Вытрымаем гэты трэнд, будзем працаваць у такім ключы — у нас усё атрымаецца»**, — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што цяпер выканальніцкай дысцыпліны не хапае: «Адпісацца, нейкую туфту даслаць Прэзідэнту міма Крутога. Давай, Прэзідэнт, там разбірайся». У прыклад кіраўнік дзяржавы прывёў работу па распрацоўцы інвестыцыйнай праграмы. «Найважнейшы дакумент. Я яго не падпісаў, як звычайна, вярнуў ураду. Вы мне зноў выкідваеце, і тры ці чатыры чалавекі прыйдуць мне дакладваць. Тыя, хто рыхтаваў гэтую праграму. А дзе альтэрнатыўнае меркаванне? Ці ўсё мы там будзем будаваць, ці туды мы грошы накіруем? Вось гэтага бяздумнага быць не павінна», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што трэба не праводзіць мерапрыемствы дзеля мерапрыемстваў, а неабходна засяродзіцца на канкрэтных пытаннях. Тое самае датычыцца і паслоў. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт, што іх галоўная задача — развіццё гандлёва-эканамічных адносін. **«Ёсць гандаль, гандлёвае абарачэнне — добра. Няма гандлю — не працуеце. Вось адзінае да вас патрабаванне»**, — канстатаваў ён.

### «МЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ МАКСІМУМ, КАБ ФОРМУЛА СПРАВЯДЛІВАСЦІ Ў ЦЭНАЎТВАРЭННІ ПРЫСУТНІЧАЛА»

Прэзідэнт прызначыў Артура Карповіча міністрам антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Да гэтага часу ён працаваў саветнікам аддзялення Пасольства Беларусі ў Расіі ва Уфе.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу новага міністра, што цяпер у краіне ідзе выпрацоўка той формулы цэнаўтварэння, па якой мы будзем працаваць. «Вопыту ў сусветнай практыцы такога няма. Але хачу яшчэ раз падкрэсліць, што гэта задача ўрада. Ні ў якім разе не міністэрства», — сказаў ён. Звяртаючыся да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што спіхваць гэтыя пытанні на міністэрства ні ў якім разе нельга. «Гэта павінен выпрацаваць урад. Трэба прыцягнуць з Адміністрацыі людзей — накіроўвайце. Трэба з Міністэрства гандлю, там добрыя спецыялісты, — бярыце. Працуйце і выпрацоўвайце. У найбліжэйшы час — Снапкова (першага віцэ-прэм'ера Мікалая Снапкова. — **«Зв.»**) папярэджваў, ён адказвае за гэта ва ўрадзе — павінны быць унесены канкрэтныя прапановы», — сказаў Прэзідэнт. І паставіў задачу перад Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю вывучыць вопыт савецкага гандлю і зрабіць усё, каб на прылаўках быў асартымент, не пералік тавараў. «Як спецыяліст вы разумееце, пра што я кажу. **І цэны каб ні ў якім разе не скакалі, асабліва ўверх. Гэта вы павінны бачыць на аб'ектах гандлю — у магазінах. Няважна, якой уласнасці яны — дзяржаўныя або прыватныя»**, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Артура Карповіча.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, «нашы ўжо рыначнікі перашалелі» ў сувязі з заявамі аб тым, што дзяржава будзе кантраляваць прыватныя прадпрыемствы. Ён зрабіў акцэнт, што прыватныя прадпрыемствы дзяржава будзе кантраляваць і накіроўваць іх работу так, як і прамысловыя. «Таму тут ніякіх ваганняў быць не можа. Яны ўсе дзяржаўныя прадпрыемствы, паколькі размешчаны на тэрыторыі нашай дзяржавы і абслугоўваюць наша насельніцтва», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу, што на гандаль заўжды скардзіліся і скаргі будуць. Але павінен быць трэнд на зніжэнне іх колькасці, што адбываецца апошнім часам. На гэта кіраўнік дзяржавы арыентуе кіраўніцтва МАРГ. «У той жа час я выдатна разумею, што такое цэны ў магазінах. Гэта цэны на міжнародных рынках, гандлёвых пляцоўках. Гэта цэны ў Расіі, з якой мы гандлюем. Вы лепш за мяне ведаеце, што там адбываецца. Я гэта ўсё ўлічваю. Але **мы павінны зрабіць максімум да таго, каб у нас усё ж такі формула справядлівасці ў цэнаўтварэнні прысутнічала»**, — паставіў задачу Прэзідэнт. Ён паўтарыў сваё патрабаванне: не павінна быць так, што нейкія засавальнікі, дырэктары і начальнікі ходзяць з кішэнямі, грашыма набітымі, а кантралёр-касір або грузчык на складзе вядуць жабрацкае існаванне. «Такога быць не павінна. **Павінна быць справядліва.** Таму дзейнічайце! Вы — чалавек дасведчаны, які пабачыў нямала ў жыцці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да новага міністра.

### АД ПАДАТКААБКЛАДАННЯ ШМАТ ШТО ЗАЛЕЖЫЦЬ, КАЛІ НЕ ЎСЁ

Дзмітрый Кійко прызначаны міністрам па падатках і зборах. Да гэтага ён быў першым намеснікам міністра фінансаў. Прэзідэнт заўважыў, што ў нашай краіне больш-менш падатковая сістэма. Але параіў міністру паглядзець свежым вокам, што яшчэ трэба зрабіць, і ўнесці прапановы, калі нешта трэба змяніць. «Таксама вас арыентую на тое, каб вы не пераждывалі за залішнія рынкавыя катэгорыі. Нам патрэбна нармальнае жыццё і нармальная работа прадпрыемстваў. Ад падаткаабкладання шмат што залежыць, калі не ўсё часам», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што падатковая сістэма павінна быць справядлівай. «Не скажу, што ў нас усё справядліва. Паглядзіце льготы, якімі мы «абклалі» многія прадпрыемствы, якія гэтыя льготы мець не павінны. Ды і на насельніцтва. Той, хто павінен мець падтрымку і льготы, той павінен мець. Хто не — значыць, не. Павінен працаваць, упірацца і падтрымліваць дзяржаву. Нам гэта ў гэты час вельмі патрэбна. Па ўсіх кірунках», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

### Вельмі важна не дапусціць перакосаў

У размове з журналістамі **Артур Карповіч** падкрэсліў, што формула цэнаўтварэння павінна ўлічваць інтарэсы ўсіх удзельнікаў рынку, у тым ліку і спажыўцоў. Вельмі важна не дапусціць перакосаў. Формула павінна быць справядлівай і для вытворцаў. «Ён павінен разумець, што працуе не ў страту сабе і, фарміруючы цану на адгружаную прадукцыю, ён дае магчымасць зарабіць свайму прадпрыемству, калектыву, павысіць заработную плату ў тых межах, у якіх гэта магчыма», — сказаў міністр. Ён адзначыў, што рашэнне пакуль не сфарміравана, але знаходзіцца ў заключнай стадыі ў высокай ступені гатоўнасці.

**Дзмітрый Кійко, новы міністр па падатках і зборах**, расказаў, што карэнных змен у падатковай сістэме не будзе. «Усе змены мы зрабілі ў папярэднія гады. Рэфармавалі, спрашчалі падатковую сістэму. Таму сёння маем дастаткова стандартны набор інструментаў. І задача, па-першае, каб падатковая сістэма была справядлівай. Другое — павышаць эфектыўнасць гэтых інструментаў», — сказаў ён.

«Самае галоўнае, каб плацельшчыкі своечасова і ў поўным памеры плацілі падаткі. А задача падатковай службы ў тым, каб яна дапамагала ім гэта рабіць стварэннем зручных і зразумелых сэрвісаў», — падкрэсліў міністр.

Журналісты пацікавіліся, ці будзе ў краіне ўведзены падатак на багацце. «Не бачу неабходнасці ўвядзення нейкіх асобных падаткаў», — адказаў на гэта кіраўнік ведамства. Дзмітрый Кійко падкрэсліў, што стандартны пералік падаткаў, які цяпер існуе ў краіне, адпавядае агульнапрынятым стандартам і дае магчымасць вырашаць неабходныя задачы, у тым ліку дыферэнцыраваць па ўзроўні так званага багацця.

**Задача ад Першага**

*«Міністэрству аховы здароўя перадайце, каб яны сур'ёзна прааналізавалі эпідэмсітуацыю ў Беларусі. Нам трэба прымаць дадатковыя меры да таго, што яны прынялі. Калі ласка — усё ў краіне закуплена тое, што не было выраблена, і лекі, каб зберагчы вас і вашых дзяцей ад хвароб.»*

*Аляксандр Лукашэнка падчас урачыстага пуску артэзіянскай вады з падземных крыніц для водазабеспячэння Мінска. 10 студзеня 2025 года.*

# Дадатковыя меры для мінімізацыі рызык

**Намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Святлана НЯЧАЙ:**

— З улікам меркаванага росту захворвання на вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў канцы студзеня — пачатку лютага прапрацоўваецца комплекс дадатковых мерапрыемстваў па мінімізацыі рызык распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый у арганізаваных калектывах і ў цэлым сярод насельніцтва.

Сярод прапанаваных і меркаваных мер асноўнае месца займае, безумоўна, бяспечная арганізацыя медыцынскай дапамогі ў установах аховы здароўя. У першую чаргу ў паліклініках вядзенне раздзельнага прыёму пацыентаў з саматычнымі захворваннямі і з прыкметамі вострых рэспіраторных інфекцый.

Улічваючы тое, што сярод усіх тых, хто звярнуўся з прыкметамі рэспіраторных інфекцый, 60 працэнтаў — дзеці, асаблівая ўвага ўдзяляецца арганізацыі супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў і мінімізацыі рызык распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый у дзіцячых калектывах, ва ўстановах адукацыі — школах, дзіцячых садках. Педагогі і медыцынскія работнікі вядуць работу па недапушчэнні ў арганізаваныя калектывы дзяцей з прыкметамі рэспіраторных інфекцый. Гэта так званыя ранішнія фільтры, якія падразумяваюць своечасовае выяўленне дзяцей з прыкметамі ВРІ.

Школьнікі з прыкметамі захворвання могуць адсутнічаць ва ўстановах адукацыі да пяці дзён без прадастаўлення медыцынскай даведкі. Такая мера ўведзена для таго, каб не ствараць залішняй нагрузкі для пацыентаў і арганізацый аховы здароўя, а таксама мінімізаваць рызыкі паўторнага інфіцыравання дзяцей пры наведванні паліклінік.

На прадпрыемствах і ў арганізацыях важнымі з'яўляюцца эфектыўнае функцыянаванне сістэм вентыляцыі, правядзенне вільготнай прыборкі, праветрывання, стварэнне ўмоў для захавання асабістай гігіены.

Тым часам працягваецца вакцынацыя супраць грыпу, COVID-19. Імунітэт пасля прышчэпкі фарміруецца ў сярэднім два тыдні, таму яшчэ ёсць магчымасць зрабіць яе тым, хто не змог зрабіць гэта раней. Вакцына, якая выкарыстоўваецца супраць COVID-19, забяспечвае абарону да 12 месяцаў.

Улічваючы, што ў нас у запасе як мінімум два тыдні, а для фарміравання імунітэту гэтага часу дастаткова, прашу людзей з груп рызыкі скарыстацца гэтай магчымасцю і вакцыніравацца як ад грыпу, так і і ад каранавіруснай інфекцыі.

Разам з тым здароўе шмат у чым залежыць ад адказных адносін кожнага чалавека. У сезон высокай актыўнасці рэспіраторных вірусаў мэтазгодна выконваць правілы асабістай гігіены: старанна мыць рукі і імкнуцца не дакранацца да твару, мінімізаваць знаходжанне ў месцах масавага збору людзей. Пры кашлі, чханні важна выконваць рэспіраторны этыкет: выкарыстоўваць насоўку або чхаць/кашляць у выгін локця. Пры з'яўленні сімптомаў ВРІ, каб абараніць навакольных, варта выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай абароны органаў дыхання.

Акрамя таго, важна актыўна займацца фізкультурай і спортам, больш знаходзіцца на адкрытым паветры, рацыянальна харчавацца, паўнацэнна высыпацца. Гэта ўсё, што мы з вамі маем, і ўсё тое, чым мы з вамі можам падмацаваць сваё здароўе, каб не дапусціць захворванняў.

**Алена КРАВЕЦ.**

САЦАПЫТАННЕ

# МАЛАДЫЯ ВЫБІРАЮЦЬ

## Больш за 76 % моладзі плануе ўзяць удзел

Менавіта такія лічбы агучыў БелТА старшыня Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый Павел АЛЕКСА, каментуючы даныя анлайн-апытання БКМА «Беларусь будучыні — выбар маладых».

Ці плануеце вы ўзяць удзел у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 26 студзеня 2025 года?




Як заўважыў старшыня БКМА, маладыя людзі ўсведамляюць значнасць гэтай электаральнай кампаніі для вызначэння сваёй будучыні і высокую ролю ў гэтым пытанні Прэзідэнта краіны, якога ўспрымаюць як гаранта рэалізацыі сваіх чаканняў. Па выніках сацапытання 76,7 % рэспандэнтаў зазначылі, што плануюць паўдзельнічаць у выбарах кіраўніка дзяржавы, 17,8 % — пакуль не вызначыліся, а «не» адказалі толькі 5,5 %.

«Дадзеныя лічбы гавораць аб павышэнні грамадзянскай актыўнасці, паколькі мы бачым, што дастаткова высокі працэнт моладзі ўжо выказвае жаданне прыйсці на выбарчыя ўчасткі. Гэта сведчыць аб тым, што людзі разумеюць каштоўнасць кожнага голасу і важнасць іх удзелу ў выбарчым працэсе. Бо, выконваючы свой грамадзянскі абавязак, аддаючы свой голас, яны ўплываюць на грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне, на сваю будучыню. І імкнуцца гэту магчымасць максімальна выкарыстоўваць, — адзначыў Павел Алекса. — Мы бачым, што ў грамадстве сфарміраваўся запыт на рэалізацыю сваіх правоў, абавязкаў, абарону інтарэсаў праз грамадзянскую актыўнасць: членства ў палітычных партыях і грамадскіх аб'яднаннях і, вядома ж, актыўны ўдзел у грамадска-палітычных падзеях у нашай краіне, у тым ліку ў выбарах».

Таксама былі пытанні наконт задач, на якіх павінен засяродзіцца выбраны Прэзідэнт. Адказаўшы на іх, моладзь

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# ЗА НЕБА ЯСНАЕ, ЗА ДУМКІ

«Марафон адзінства» развітаўся з Наваполацкам, накіроўваючыся далей па краіне. Два дні для горада-нафтавіка прайшлі ў атмасферы паўсюднага свята на вуліцах, у гандлёвых цэнтрах, на прадпрыемствах. І кожны, хто так ці інакш змог далучыцца да мерапрыемстваў рэспубліканскай акцыі, яшчэ раз упэўніўся ў тым, што моц беларусаў — у адзінстве.











# БУДУЧЫНЮ

## у выбарах Прэзідэнта




вылучае па ступені прыярытэтнасці: забеспячэнне міру і бяспекі (67,7 %), рост дабрабыту грамадзян (48,1 %), барацьбу з інфляцыяй і ростам цэн (41,8 %), эканамічны ўздым і рост вытворчасці (32,3 %), умацаванне пазіцый Беларусі на міжнароднай арэне (23,5 %).

«Тут трэба ў прынцыпе глядзець на настрой грамадства апошнім часам. У нас гэта не першае даследаванне, якое праводзіцца па падобнай тэматыцы. І сапраўды, у людзей сёння пераважаюць агульнаграмадзянскія каштоўнасці, такія як мір і бяспека, здароўе, сацыяльны дабрабыт свой і членаў сям'і. У нас грамадства ўстойлівае і стабільнае. Кожны ведае, што ён можа разлічваць на бясплатную адукацыю, медыцыну, першае працоўнае месца. Гэта пэўныя гаранты, якія ўвасабляюць базавыя патрэбы грамадзян», — дапоўніў Павел Алекса.

Такім чынам, абагульняльныя вынікі сацапытання сведчаць аб тым, што беларуская моладзь цэніць існуючую і ўстойлівую мадэль дзяржавы як інстытута, здольнага задаволіць іх чаканні.

Апытанне праводзілася з 16 снежня 2024 года да 3 студзеня 2025-га Беларускім камітэтам маладзёжных арганізацый. Сярод апытаных (7260 чалавек) — навучэнцы школ і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай або прафесійна-тэхнічнай адукацыі (14—17 гадоў), студэнты і маладыя даследчыкі (18—25 гадоў), працоўная моладзь (25—31 год). Гэта ўжо пакаленне, якое сфарміравалася ў гады суверэннага развіцця незалежнай Беларусі, і час іх жыцця — гэта перыяд паступальнага развіцця краіны і росту дабрабыту насельніцтва.

# НЕ РАЗБУРАЦЬ, А РЭГІСТРАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У заяве павінна быць прадугледжана згода паўналетніх грамадзян, якія маюць права валодання і карыстання гэтымі аб'ектамі, а таксама ўдзельнікаў агульнай долевай уласнасці на прыёмку ў эксплуатацыю аб'ектаў у спрошчаным парадку. Для атрымання кансультацыі і афармлення акта прыёмкі ў эксплуатацыю жылых дамоў грамадзянам неабходна звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган па месцы размяшчэння зямельнага ўчастка. Для адлюстравання тэхніка-эканамічных паказчыкаў аб'екта рэкамендуецца прыкласці дакументы, якія пацвярджаюць права карыстання зямельным участкам, і ведамасць тэхнічных характарыстык.

Заява падаецца ў структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Уся працэдура прыёмкі аб'екта ў эксплуатацыю займае не больш за месяц.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЧЫСТЫЯ!

## КАНЦЭРТ ЕДЗЕ НА ЗАВОД!

> **Адметнасць «Марафону адзінства» — праект для простых рабочых заводаў і прадпрыемстваў «Разам працуем, разам спяваем!», які вельмі палюбіўся ўсім працаўнікам краіны. Гэта выдатная магчымасць выказаць нашым людзям словы падзякі за нялёгкую і часам небяспечную працу літаральна на месцы, амаль не адрываючыся ад вытворчага працэсу.**

У Наваполацку разам спявалі два дні, свята пад чырвона-зялёным сцягам прыйшло на адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Палімір», «Нафтан», «Вымяральнік», «Белсплат». Музычныя падарункі калектывам дарылі Жанэт, Ганна Благава, Вольга Рыжыкава і ТЕО, Тарас Прысяжнюк, Вольга Булай, Аляксандра Мелех і іншыя.

Гаворачы аб адраджэнні традыцыі цэхавых канцэртаў на «Марафоне адзінства», **гендырэктар ААТ «Нафтан» Алег ЖЭБІН** падкрэсліў, што такія мерапрыемствы яшчэ больш аб'ядноўваюць дружны калектыў нафтазавода. «Гэта, па-першае, для нас вялікі гонар, а па-другое, творчасць і праца — два бакі аднаго медаля, што дазваляе нам добра працаваць і добра адпачываць. Гэта тая ідэя аб'яднання нацыі для дасягнення высокіх мэт, росквіту», — падзяліўся кіраўнік прадпрыемства.

**Старшыня цэхавага камітэта цэха № 015 ААТ «Палімір» Аляксандр ВАСІЛЕЎСКІ** выказаў захапленне ад таго, што, нягледзячы на шчыльны працоўны графік, работнікі завода змаглі сабрацца на такой важнай падзеі.

> **Ён адзначыў, што «Марафон адзінства» стаў не толькі магчымасцю для завадчан сустрэцца, але і адчуць сябе часткай усёй Рэспублікі Беларусь, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці.**

«Вельмі здорава, што «Марафон адзінства» даехаў да Наваполацка. Мы, жыхары горада, пра гэта вельмі прасілі, і вось мары спраўджваюцца. Канцэрт на родным прадпрыемстве — гэта ўвогуле агонь! Бачыце, як шчыра завадчане рады, якімі апладысментамі сустракаюць кожную песню?!.. Такое не адыграеш на камеру: для нас гэта сапраўднае свята», — падзялілася эмоцыямі **мантажнік радыёэлектроннай апаратуры і прыбораў ААТ «Вымяральнік» Кацярына ЛУК'ЯНАВА.**




## МАЙСТАР-КЛАС АД МЭТРАЎ

У дзіцячай школе мастацтваў № 1 г. Наваполацка прайшоў канцэрт-лекцыя ад артыстаў Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемства стала падарункам для маленькіх навучэнцаў школы. «Кожнае наша выступленне, напэўна, адрозніваецца тым, што мы заўсёды абнаўляем праграму, пераглядаем яе. Сёння мы прывезлі некалькі новых твораў беларускіх кампазітараў. Дзеці сустракаюць нас вельмі цёпла і з вялікім энтузіязмам. Мы імкнёмся стварыць душэўную, цёплую атмасферу не толькі падчас канцэрта, але і падчас шчырай размовы. Думаю, што пасля такіх сустрэч дзеці вяртаюцца з жаданнем дасягаць новых вышынь у музычным мастацтве», — адзначыў **галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Віталь КУЛЬБАКОЎ.**

## ХУТЧЭЙ НА ВЫСТАЎКУ!

Яшчэ адным прыемным сюрпрызам для жыхароў і гасцей Наваполацка стала выстаўка спецыяльнай тэхнікі прадпрыемстваў горада, якая разгарнулася на плошчы Будаўнікоў 14 студзеня. Тут жа стартавала акцыя «Гэта мая краіна!», падчас якой трэба было сфатаграфавацца на фотазоне акцыі і атрымаць ад арганізатараў «Марафону» фірменны падарунак з лагатыпам рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі. Дарэчы, на своеасаблівы выклік адгукнуліся сотні навапалачан.

## ЯРКІ АКОРД

Прыгожа і душэўна «Марафон» развітаўся з гарадам-нафтавіком святочным канцэртам, які прайшоў на пляцоўцы Палаца культуры ААТ «Нафтан». У маштабным канцэрце ўзялі ўдзел Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», гурт «Аўра», Валерый Шмат, Жанэт, «Ружовыя ружы», Ганна Благава і іншыя зоркі айчыннай эстрады.

«Нельга перадаць эмоцыі ад канцэрта. Гартаючы музычнымі нумарамі старонкі нашай гісторыі, амаль заўсёды ў вачах стаялі слёзы — ад болю і памяці, ад гонару за тое, што мы маем. Шчыры дзякуй за тое, што такое важнае і патрэбнае свята яшчэ мацней гуртуе нас», — падзялілася эмоцыямі жыхарка горада Таццяна Іванова.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

## У тэму

**Наталля ТАРАСЕНКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Магілёўскай сельскай выбарчай акрузе № 88, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні:**

— Указ вельмі важны, асабліва для жыхароў сельскай мясцовасці. У маю акругу ўваходзяць сем сельсаветаў Магілёўскага раёна і часткова Магілёў. На тэрыторыі раёна знаходзіцца 179 садаводчых таварыстваў, уласнікамі якіх з'яўляюцца болей чым 40 тысяч чалавек. Указ дазваляе ўпарадкаваць шматлікія моманты. Дачныя ўчасткі адводзіліся і дамы будаваліся даўно, шмат чаго змянілася ў заканадаўстве. Новы ўказ Прэзідэнта яшчэ раз дазваляе пераканацца, што мы глыбока сацыяльна арыентаваная дзяржава, дзе ўсё робіцца для людзей.

Чалавек, які нешта будуе, не заўсёды суадносіць гэта з заканадаўствам. Але калі ён гэта робіць, то для таго, каб застацца тут і жыць. І магчымасць узаконіць ужо пабудаванае дазваляе яму не страціць тыя грошы, якія ён уклаў у незаконнае будаўніцтва. Раней падчас прыёмаў грамадзян зваротаў на гэтую тэму было вельмі шмат.

Высвятлялася, што гаспадарчыя пабудовы, а дзесьці і сам дом заяўніка выходзілі за межы ўчастка. Цяпер гэтыя межы вельмі дакладна вызначаюцца з дапамогай спадарожніка. Калі такія факты мелі месца, даходзіла нават да таго, што пабудову трэба было знесці. Новы Кодэкс аб зямлі і ўказы Прэзідэнта дазваляюць узаконіць усе пабудовы. І тым самым урэгуляваць масу пытанняў, якія раней вырашаліся выключна праз суд.

Мы як дэпутаты вывучаем праблемы нашых грамадзян, цікавімся, з якімі цяжкасцямі яны сутыкаюцца, акумулюем іх заўвагі, а потым усё гэта аналізуецца і знаходзіць адлюстраванне ў заканадаўчых актах. Для таго, каб беларусам жылося і працавалася на сваёй зямлі спакойна і зручна. Каб яны стварылі сваё радавое гняздо ў адпаведнасці са сваімі запытамі, для сябе і сваіх нашчадкаў. І пры гэтым засталіся ў рамках закона, не былі парушальнікамі. Часам ім становішся не наўмысна, па няведанні. Новы ўказ дае магчымасць выправіць памылку і зарэгістраваць свае збудаванні. Тым больш што вёска адраджаецца, і дзяржава зацікаўленая, каб людзі вярталіся туды. Знамянальна, што гэта адбываецца ў Год добраўпарадкавання. Сама назва года падразумявае, як важна ствараць добрыя ўмовы для жыцця. Для кожнага чалавека добраўпарадкаванне пачынаецца менавіта са свайго дома, асабістага падворка. Спачатку трэба прывесці ў парадак тое, што бліжэй да цябе, а пасля з'явіцца ахвота ствараць прыгажосць на сваёй вуліцы, у населеным пункце, каб месца жыцця было камфортным і зручным.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ВАЖКАЯ ПАДТРЫМКА

## Вызначаны памер сямейнагакапіталу на 2025 год



З 1 студзеня 2025 года памер сямейнага капіталу складае 33 275 рублёў, паведамляе прэс-служба Мінпрацы і сацабароны.

У ведамстве дадалі, што ў такім памеры сямейны капітал прызначаецца сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей у перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2025 года.

Нагадаем, што Прэзідэнт Беларусі падоўжыў тэрмін дзеяння Праграмы сямейнага капіталу яшчэ на пяць гадоў: з 1 студзеня 2025 года да 31 снежня 2029 года.

Хто можа яго атрымаць? Сямейны капітал прызначаецца шматдзетным сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступнага дзіцяці.

Дарэчы, на 1 студзеня для шматдзетных сем'яў было адкрыта 143 211 дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал», з іх 82,6 тысячы дэпазітных рахункаў на суму 826 мільёнаў долараў ЗША і 60,6 тысячы дэпазітных рахункаў на суму 1,57 мільярда рублёў.

На датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу пададзена 91 909 заяў. З іх на паляпшэнне жыллёвых умоў — 74 111, атрыманне медыцынскіх паслуг — 10 100, атрыманне адукацыі — 7693, набыццё тавараў для інвалідаў — 5.

# ДОБРЫ ЗАПАС

## Золатавалютныя рэзервы Беларусі выраслі на 127,7 мільёна долараў



За снежань 2024 года ЗВР зноў падраслі і па стане на 1 студзеня 2025-га склалі 8,92 мільярда долараў.

Як растлумачылі аналітыкі Еўразійскага банка развіцця ў сваім штотыднёвым макраэканамічным аглядзе, ключавым фактарам росту стала павелічэнне рэзерваў у замежнай валюце на 206 мільёнаў долараў. Кошт золата ў структуры рэзерваў скараціўся на 71,9 мільёна долараў з прычыны скарачэння коштаў на яго 1,6 % у снежні.

З пачатку года золатавалютныя рэзервы выраслі на 795,1 мільёна долараў.

# НА «ПЯЦЁРКУ» З ПЛЮСАМ

## ЕАЭС і КНР актуалізуюць дарожную карту гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва



На днях на пляцоўцы Еўразійскай эканамічнай камісіі прайшла рабочая сустрэча дырэктара дэпартамента гандлёвай палітыкі ЕЭК Уладзіміра Серпікава з паўнамоцным міністрам па гандлёва-эканамічных пытаннях Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Расійскай Федэрацыі Лю Цзінем, паведамілі ў прэс-службе ЕЭК.

Тэмай сустрэчы стала абмеркаванне бягучага стану і перспектыў развіцця ўзаемадзеяння, статус выканання дамоўленасцяў 4-га пасяджэння сумеснай камісіі па імплементацыі Пагаднення аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Кітаем, а таксама рэалізацыя дарожнай карты ЕАЭС — КНР, зацверджанай у 2023 годзе.

Бакамі таксама дасягнута дамоўленасць аб пачатку актыўнай падрыхтоўкі да 5-га пасяджэння сумеснай камісіі, запланаванага да правядзення ў 2025 годзе ў адной з краін Саюза.

Дырэктар профільнага дэпартамента ЕЭК прапанаваў правесці ў бягучым годзе работу па актуалізацыі дарожнай карты, уключыўшы ў яе найбольш запатрабаваныя кірункі супрацоўніцтва, якія будуць спрыяць далейшаму росту гандлю паміж дзяржавамі «пяцёркі».

Нагадаем, што з 1 лістапада 2024 года старшынства ў органах ЕАЭС перайшло нашай краіне.

# СВЕДЧАННЕ СТАБІЛЬНАЙ РАБОТЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

## Мытныя органы на 15 % павялічылі паступленні плацяжоў у рэспубліканскі бюджэт

Такая статыстыка — за 2024 год у параўнанні з 2023 годам. Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, гэта сведчыць аб стабільнай рабоце айчынных прадпрыемстваў, нягледзячы на складаную сітуацыю на мытнай граніцы ў сувязі з закрыццём сумежнымі краінамі большасці пунктаў пропуску.

«Рост плацяжоў паказвае, што тыя праблемы, якія ўзніклі са змяненнем лагістыкі, беларускім суб'ектам гаспадарання пераадолець удалося, — канкрэтызавалі ў прэс-службе ведамства. — Захад закрыў для іх рынкі збыту, эканоміка перабудавалася на ўсходні напрамак. Экспартныя тавары пераважна ідуць у дружалюбныя краіны, з іх жа паступае большая частка імпартнай сыравіны і камплектуючых для нашых прадпрыемстваў».

З мэтай забеспячэння ўмоў выезду транспарту з Беларусі, які з-за наўмысных дзеянняў сумежных краін назапашваецца ў чэргах, мытныя органы прадоўжылі работу па будаўніцтве зон чакання паблізу пунктаў пропуску. Да ўводу ў эксплуатацыю буйных зон чакання, што будуюцца паблізу беларуска-польскай граніцы, у пунктах пропуску «Брэст» і «Казловічы» часова арганізавана выдзеленая рэгістрацыя транспартных сродкаў у электроннай чарзе. Гэта садзейнічае забеспячэнню бяспекі дарожнага руху перад пунктамі пропуску.

Як падкрэслілі ў Дзяржаўным мытным камітэце, узмоцненая ўвага сканцэнтравана на забеспячэнні бяспекі — недапушчэнні ўвозу ў краіну тавараў, якія наносяць шкоду дзяржаве і грамадзянам, забеспячэнні абароненасці мытнай інфраструктуры. У 2024 годзе мытнымі органамі з незаконнага абароту канфіскавана ў два разы больш наркотыкаў і псіхатропных рэчываў, чым у 2023-м, і ў 2,5 раза — боепрыпасаў і састаўных частак да іх.


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Пресс-экструдер КМЗ-2У,** 1994 г. в.
Месторасположение:
Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Булата, 1

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 12 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после электронных торгов

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) рабочих дней** с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 6 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.02.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.02.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Бизнес РМ», Могилевская обл., г. Кировск, ул. Кирова, 70, УНП 193626295 |
| **Предмет электронных торгов № 1:** здание спасательного поста (здание специализированное иного назначения), инв. номер 600/С-72502, общей площадью 158,9 кв. м, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, д. Семков Городок | **Начальная цена (без НДС) – 270 000,00 бел. руб.** |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 623685510101000099:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания спасательного поста в районе д. Семков Городок общей площадью 0,0600 га

| | |
|---|---|
| **Предмет электронных торгов № 2.** Имущество (б/у), реализуемое одним лотом, в составе: 1. Пассажирский теплоход для перевозки пассажиров на местн. линии «Новы Нясвіж» (1954 г. в.), рег. номер РБ-133; 2. Причальный понтон для пассажирских судов «ПП-04» (1967 г. в.), рег. номер РБ-135; 3. Причальный понтон для пассажирских судов «ПП-038» (1976 г. в.), рег. номер РБ-134. Местонахождение: г. Минск, «Комсомольское озеро», музейно-парковый комплекс «Победа» | **Начальная цена (без НДС) – 50 000,00 бел. руб.** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 3012004835008022600 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота № 1 и **6 %** от цены продажи лота № 2 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 12.12.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.02.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **31.01.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
15 студзеня 2025 г. № 1 (782)

ТЭМА НУМАРА

# ПРЫГАЖОСЦЬ СТВАРАЕМ ДЛЯ СЯБЕ

**Падпісаны кіраўніком дзяржавы Указ № 1 аб абвяшчэнні 2025-га Годам добраўпарадкавання датычыцца не толькі адказных асоб і чыноўнікаў. Ён датычыцца кожнага жыхара краіны, бо добраўпарадкаванне ўсёй Радзімы пачынаецца з парадку ва ўласным доме, на ўласным падворку, на вуліцы, дзе жывеш. Шмат таксама залежыць і ад работы, арганізаванай на месцах, і тут ролю мясцовага самакіравання цяжка перааацаніць. Мы пацікавіліся ў прадстаўнікоў мясцовай заканадаўчай улады, што ў Год добраўпарадкавання стане адметнасцю іх дзейнасці.**




## Гаспадарчы падыход

### Фактары пасляховасці добраўпарадкавання

**З гэтага года на Гомельшчыне раённыя фестывалі працаўнікоў вёскі «Дажынкі» будуць праходзіць у аграгарадках з улікам напрацаванай у рэгіёне практыкі комплекснага добраўпарадкавання населеных пунктаў. З такой прапановай выступіў дэпутацкі корпус вобласці.**

Практыка комплекснага добраўпарадкавання населеных пунктаў на Гомельшчыне фактычна дае новае жыццё райцэнтрам рэгіёна. Мэта — максімальна добраўпарадкаваць тэрыторыю, рэканструяваць ці пабудаваць новыя сацыяльна значныя аб'екты, вывесці на новы ўзровень інфраструктуру населеных пунктаў. Асаблівая ўвага — стану інжынерных камунікацый, дарожнай інфраструктуры, жыллёвага фонду, устаноў адукацыі, аховы здароўя, культуры, бытавога абслугоўвання, сувязі, аб'ектаў гандлю.

— У Гомельскай вобласці добраўпарадкаванне тэрыторый знаходзіцца на пастаянным кантролі органаў кіравання і самакіравання ўсіх узроўняў, бо парадак на зямлі — гэта пастаянная і штодзённая праца, — перакананa **член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.** — На сесіі абласнога Савета дэпутацкі корпус выказаў сваю прапанову аб правядзенні раённых фестываляў «Дажынкі» з 2025 года ў аграгарадках з улікам напрацаванай практыкі комплекснага добраўпарадкавання населеных пунктаў. Раённым дадзена даручэнне да 1 лютага падрыхтаваць планы добраўпарадкавання кожнага населенага пункта.

Як падкрэсліла сенатар, для Гомельшчыны значны фактар пасляховасці добраўпарадкавання на месцах — заахвочванне мясцовых жыхароў. Ініцыятывы па паляпшэнні якасці жыцця людзей, навядзенні парадку ў населеных пунктах і ўвогуле развіццё патэнцыялу той ці іншай тэрыторыі актыўна падтрымлівае дэпутацкі корпус Гомельшчыны. У мінулым годзе Гомельскі абласны Савет дэпутатаў накіраваў у абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў 111 заявак для ўдзелу ў конкурсным адборы грамадзянскіх ініцыятыў. Пераможцамі было прызнана 25 праектаў рознай тэматыкі з усіх рэгіёнаў вобласці. Чарговы конкурсны адбор праектаў грамадзянскіх ініцыятыў жыхароў Гомельшчыны адбудзецца ўжо на гэтым тыдні — 17 студзеня.

Старшыня абласнога Савета дэпутатаў звярнула ўвагу, што ў канцы мінулага года па даручэнні старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко прайшла суцэльная інвентарызацыя тэрыторый з мэтай выяўлення аб'ектаў, што не выкарыстоўваюцца, усіх форм уласнасці, у тым ліку жыллёвага фонду.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# З клопатам аб пацыентах, медработніках і пажылых

## Падрабязнасці працоўнага тыдня сенатараў

• Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня праўлення «Беларусбанка» Віктар Ананіч і міністр аховы здароўя Аляксандр Хаджаеў падпісалі пагадненне аб рэалізацыі сацыяльнага праекта «Даступная меддапамога з Беларусбанкам», дзякуючы якому будзе абноўлены парк медыцынскіх аўтамабіляў устаноў аховы здароўя, якія працуюць у сельскай мясцовасці і невялікіх населеных пунктах. За спонсарскую дапамогу будуць набыты 12 аўтамабіляў (па два ў кожную вобласць). «Для банка праект стане сёмым у партфелі сацыяльных ініцыятыў, — адзначыў сенатар. — Сімвалічна, што пачынаецца ён у Год добраўпарадкавання і прадоўжыцца на час пяцігодкі якасці. Набываючы сучасныя медыцынскія аўтамабілі айчыннай вытворчасці, мы будзем клапаціцца не толькі аб пацыентах, але і аб людзях адной з самых высакародных і адказных прафесій — медыцынскіх работніках».

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід Заяц у рамках акцыі «Ад усёй душы» сустрэўся з жыхарамі Крычава, якія стаялі каля вытокаў будаўніцтва суверэннай Беларусі. Размаўляючы з людзьмі залатога ўзросту, якія працавалі ў свой час у розных галінах эканомікі, сенатар падзякаваў не толькі ім асабіста, але і ў іх асобе ўсім жыхарам старэйшага пакалення раёна за працавітасць і актыўную грамадзянскую пазіцыю, пагутарыў на розныя тэмы. «Сёння адной з асноўных дзяржаўных задач, якая паспяхова вырашаецца, з'яўляецца стварэнне адзінага, маналітнага грамадства, — падкрэсліў Леанід Заяц. — Гэта немагчыма без удзелу старэйшага пакалення, бо стабільнае грамадства, свабодную нацыю немагчыма стварыць без пераемнасці пакаленняў».

• Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Гарошкін у рамках рэспубліканскай акцыі «Ад усёй душы» наведаў пажылых грамадзян, якія пражываюць у Магілёўскім



Фота sovrep.gov.by

спецыяльным доме для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў. Шмат цёплых слоў, пажаданняў моцнага здароўя і аптымізму было адрасавана прысутным на сустрэчы людзям старэйшага пакалення. Кожнаму былі ўручаны падарункі. «Рэспубліканская акцыя «Ад усёй душы» сведчыць аб адзінстве нашага грамадства і дае магчымасць выказаць словы падзякі і ўдзячнасці людзям «сярэбранага» ўзросту за вялізны ўклад, які яны ўнеслі, каб наша родная Беларусь квітнела, — адзначыў парламентарый. — Падтрымка старэйшага пакалення заўсёды была і застаецца прыярытэтным кірункам сацыяльнай палітыкі ў нашай краіне».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПРЫГАЖОСЦЬ СТВАРАЕМ ДЛЯ СЯБЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— У гэтай рабоце быў задзейнічаны дэпутацкі корпус першаснага ўзроўню — нашы асноўныя памочнікі на месцах, якія валодаюць поўнай і дакладнай інфармацыяй аб стане спраў на іх тэрыторыях, — падкрэсліла Кацярына Зенкевіч. — Цяпер праводзіцца аналіз атрыманых даных, адносна кожнага аб'екта вызначаецца план дзеянняў, і на працягу бягучага года будуць прыняты меры.

На кантролі дэпутатаў Гомельшчыны застаецца павышэнне эфектыўнасці выкарыстання нерухомай маёмасці і ўключэнне яе ў гаспадарчы абарот. За 11 месяцаў мінулага года ў сельскіх населеных пунктах рэгіёна больш за 140 домаўладанняў набылі новых гаспадароў, было добраўрападкавана больш за 420 пустых дамоў, больш за 900 закінутых дамоў знесена, а гэта ў тым ліку клопат аб бяспецы грамадзян у населеных пунктах.

Заўважны плён ад рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 сакавіка 2021 года № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі», якім значна спрошчаны парадак адчужэння пустых домаўладанняў. І як вынік, у вобласці штогод рэалізуецца ў сярэднім больш за 140 дамоў пры ранейшым паказчыку каля дзесяці.

— Тым не менш у гэтай рабоце яшчэ ёсць рэзервы, важна актывізаваць работу па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 116, — звярнула ўвагу сенатар. — На тэрыторыі вобласці для выканання даручэння кіраўніка дзяржавы фарміруецца праграмны комплекс мер па ўключэнні ў гаспадарчы абарот зямель, якія не выкарыстоўваюцца: сельгасарганізацый, зямельных участкаў у населеных пунктах, скарачэнні пустых дамоў. Галоўная задача — навядзенне парадку ў цэлым, у тым ліку на ўчастках дамоў, што маюць прыкметы пустых і якія часта з'яўляюцца аб'ектамі сельгасарганізацый, ЖКГ і іншых галін. Работа з кожным аб'ектам, які мае прыкметы пустога, а таксама па кожным вызваленым зямельным участку павінна знаходзіцца на кантролі да поўнага добраўпарадкавання, — падкрэсліла Кацярына Зенкевіч.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# Складальнікі якасці жыцця



## Па якіх кірунках працягнецца добраўпарадкаванне ў Брэсцкім раёне

**БРЭСЦКІ раён у многім асаблівы. Ну хоць бы тым, што ў 142 населеных пунктах пражывае больш за 45 тысяч чалавек сельскага насельніцтва. Ёсць шэраг даволі буйных вёсак, аграгарадкоў. Напрыклад, у адным толькі Матыкальскім сельсавеце пражывае 8 тысяч чалавек, што параўнальна з асобнымі райцэнтрамі краіны. Да таго ж на тэрыторыі раёна размяшчаецца 250 дачных таварыстваў абласнога цэнтра, і летам колькасць насельніцтва раёна павялічваецца амаль удвая. Апошняе таксама патрабуе дадатковых намаганняў у справе навядзення парадку.**

### Спартыўныя і дзіцячая пляцоўкі, павільён на прыпынку

**Старшыня Брэсцкага раённага Савета Уладзімір ХВАЦІК** адзначае, што актыў раёна, мясцовая ўлада ўспрынялі аб'яўленне 2025 года Годам добраўпарадкавання як магчымасць падкрэсліць значнасць работы, якой займаюцца сельвыканкамы апошнія дзесяцігоддзі, а таксама як стымул усяляк развіваць, удасканальваць дзейнасць ва ўказаным кірунку.

— У пачатку года кожны сельскі Савет складае план добраўпарадкавання, якога і прытрымліваецца ў сваёй рабоце, — гаворыць старшыня райсавета. — А выкананне пунктаў і мерапрыемстваў названага плана становіцца магчымым дзякуючы бюджэтнай падтрымцы, уласным сродкам, спонсарскай дапамозе, а таксама ўдзелу грамадзян у агульных добрых справах.

Вялікая работа па добраўпарадкаванні, навядзенні парадку, паляпшэнні вонкавага выгляду населеных пунктаў праведзена летась. Так, у парку гарадскога пасёлка Дамачава замест пустэчы паявілася спартыўная пляцоўка. Такая ж пляцоўка для заняткаў фізкультурай і спортам людзей усіх узростаў уладкавана ў Астрамечаве. Урачыстае адкрыццё абодвух спартыўных комплексаў адбылося ў канцы года.

Старшыня райсавета называе некалькі лічбаў: цягам года пасаджаны 781 дрэва, 390 кустарнікаў, высаджана амаль дзевяць тысяч кветак. Таксама было спілавана 153 аварыйныя дрэвы. Усё гэта рабілася намаганнямі як супрацоўнікаў жыллёва-камунальнай службы, так і саміх грамадзян. За год у раёне правялі каля сотні суботнікаў. Дарэчы, падчас працоўных акцый прыбралі 80 несанкцыянаваных звалак розных памераў.

Уладзімір Хвацік падкрэслівае важнасць удзелу грамадзян у агульных добрых справах і прыводзіць у прыклад Знаменскі сельсавет. У вёсцы Старадзеч названага сельсавета пражываюць 1860 чалавек, прыкладна палова з іх — праваслаўныя хрысціяне, другая — евангельскія хрысціяне-баптысты. Усе жывуць дружна, ніякіх непаразуменняў на рэлігійнай глебе ніколі не было. Усе разам працуюць на суботніках, удзельнічаюць у агульных справах. Адным з апошніх прыкладаў сумеснай работы стала ўладкаваннне прыпыначнага пункта для дзяцей. Вёска Страдзеч вялікая, вучняў збірае школьны аўтобус у трох месцах. Адно з іх знаходзіцца на ўскраіне населенага пункта, у непагадзь там асабліва некамфортна было стаяць дзецям у чаканні транспарту. Гэта апошні з трох прыпынкаў, два былі абсталяваны раней. Сабраліся, пагаварылі, рашылі зрабіць і гэты. Сельгаспрадпрыемства «За мір» выдзеліла матэрыялы, рэлігійная суполка ўзяла на сябе выраб і ўстаноўку павільёна. Бацькі школьнікаў правялі першы этап добраўпарадкавання. Затым прыйшлі спецыялісты і ўстанавілі павільён. І дзецям больш не даводзіцца чакаць аўтобус пад дажджом альбо мокрым снегам.

Летась маладыя сем'і гэтай вёскі па сваёй ініцыятыве і галоўным чынам за свае сродкі ўладкавалі дзіцячую пляцоўку ў раёне новай забудовы. Сельвыканкам узгадніў месца, дапамог з тэхнікай пры дастаўцы габарытнага абсталявання і паспрыяў добраўпарадкаванню вакол пляцоўкі.

### Догляд помнікаў і планы на год

Яшчэ адзін вялікі пласт работы датычыцца абнаўлення, добраўпарадкавання, догляду помнікаў і памятных месцаў. На гэтым робіцца асаблівы акцэнт сёння, калі мы рыхтуемся адзначыць 80-ю гадавіну Вялікай Перамогі.

На тэрыторыі раёна маецца 119 помнікаў і памятных месцаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. З іх 65 з'яўляецца месцам пахаванняў воінаў і мірных жыхароў, дзе знайшлі вечны спачын 9835 чалавек. Устаноўлена таксама 54 абеліскі вайсковай славы. Паводле слоў старшыні райсавета, кожны год праводзіцца рэканструкцыя альбо поўнае абнаўленне аднаго-двух з іх, на іншых — добраўпарадкаванне, касметычны рамонт. Апошнім часам на многіх памянялі мемарыяльныя пліты, на іх змешчана інфармацыя пра тых людзей, у гонар якіх устаноўлены помнікі. Дарэчы, нядаўна паявіліся і таблічкі з QR-кодамі.

Ёсць сельсаветы, на тэрыторыя якіх знаходзіцца да паўтара дзясятка і больш такіх помнікаў. Падтрыманне іх у парадку — вялікая работа, да якой мясцовая ўлада прыцягвае школьнікаў, моладзь, працоўныя калектывы, грамадскія арганізацыі. Напрыклад, летась карэнным чынам абнавілі мемарыял у Мухаўцы.

— Работа па добраўпарадкаванні і абнаўленні помнікаў будзе працягвацца, — гаворыць Уладзімір Хвацік. — Яшчэ на гэты год маем намер асаблівую ўвагу ўдзяліць рабоце па паляпшэнні дарожнага пакрыцця вуліц унутры населеных пунктаў. Заасфальтаваныя вуліцы, тратуары ў населеным пункце — гэта не толькі зручнасць, знешні выгляд, гэта і складальнікі якасці жыцця нашых людзей. Таксама на парадку дня павелічэнне колькасці дзіцячых пляцовак. Маштабная жыллёвая забудова патрабуе адпаведнай інфраструктуры. Там, дзе ўтульна, прыгожа, зручна, людзі ахвотна ўзводзяць дамы, а значыць, будуць расці сем'і, нараджацца дзеці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел. +375 17 310-36-37 | |
| **Продавец** | МАРТ, г. Минск, ул. Кирова, 8 корп. 1. УНП 100377891 | |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Тел. +375 17 373-21-33. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by | |
| **Предмет электронных торгов – транспортные средства, бывшие в употреблении** | | |
| Лот № | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. |
| **1** | **Легковой седан GEELY SC7,** р/зн. 9902 НК-7, 2014 г. в. Месторасположение: г. Витебск, ул. Чкалова, 55 | **7 100,00** |
| **2** | **Легковой седан GEELY SC7,** р/зн. 9903 НК-7, 2014 г. в. Месторасположение: г. Гомель, пр-т Речицкий, д. 9 | **7 400,00** |
| **Шаг торгов – 5 % от начальной цены** | | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 14.02.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов | | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **13.02.2025 до 17.00** | | |
| Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Госкомимущества | | |
| **Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by | | |



**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Лоевского РайПО** (продавец) извещает о проведении **28 января 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 340/С-290109 общей площадью 376,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/4. Капитальное строение с инв. № 340/С-369 общей площадью 240,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/5. Капитальное строение с инв. № 340/С-3720 общей площадью 113,0 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/6. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 323055100001000005 |
| **Начальная цена** продажи без НДС **– 34 920,00** бел. руб. без НДС. **Задаток 1 %** – **349,20** бел. руб. |
| Условие продажи: имеется необходимость в последующем выделении земельного участка, необходимого для обслуживания и эксплуатации объектов недвижимости. После проведения торгов Продавец уполномочивает Покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка, необходимого для обслуживания предмета торгов, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с Продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению (выделению) земельного участка и прав на него, государственной регистрации и удостоверению договора купли-продажи, перехода права собственности на предмет торгов возлагаются на Покупателя |

**Продавец: Лоевское районное потребительское общество**, Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Батова, 59.

Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00** и **с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27.01.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.**

Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет.

Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

# «Беларусь — краіна магчымасцяў, дзе кожны можа рэалізаваць сябе»

## Дэпутат Алена ХАМІЦЭВІЧ — пра «Марафон адзінства» і работу з выбаршчыкамі

**Салігорск, як вядома, — горад шахцёрскі. І жыхары ў ім — упэўненыя людзі з моцным характарам, якія не пацерпяць няшчырасці. З імі прасцей працаваць чалавеку, які вырас у іх асяроддзі, які ведае ўсе праблемы знутры. Як, напрыклад, дэпутату Палаты прадстаўнікоў ад Салігорскай гарадской 68-й акругі Алене Хаміцэвіч.**



Алена Мікалаеўна — карэнная салігарчанка, шахцёрская сталіца — яе родны горад. Тут прайшло дзяцінства і юнацтва, сюды вярнулася маладым спецыялістам і шмат гадоў працавала педагогам, у прыватнасці, у Салігорскім дзяржаўным каледжы, з пасады дырэктара якога і пайшла ў дэпутаты.

***— Алена Мікалаеўна, якія праблемы хвалююць выбаршчыкаў вашай акругі? Якая работа па акрузе вядзецца ў цэлым?***

— Работа дэпутата патрабуе актыўнага ўзаемадзеяння з выбаршчыкамі. Неад'емнай часткай маёй работы з'яўляецца правядзенне асабістых прыёмаў грамадзян і прамых тэлефонных ліній. За перыяд работы ў 2024 годзе праведзена 15 асабістых прыёмаў, разгледжана больш за 50 зваротаў. Часцей за ўсё грамадзяне звярталіся на прамыя лініі і прыёмы грамадзян па пытаннях работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Людзі ўздымалі пытанні добраўпарадкавання, рамонту і эксплуатацыі жыллёвага фонду, водазабеспячэння, арэнднага і сацыяльнага жылля, ацяплення, сферы банкаўскіх паслуг, пытанні падаткаабкладання, атрымання сацыяльных ільгот і гарантый, пытанні транспартных зносін. А яшчэ хвалююць людзей бяспека дарожнага руху і ўладкаванне дзіцячых пляцовак.

Значным кірункам работы ў акрузе з'яўляецца сумесная работа з грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі, палітычнымі партыямі. Бяру ўдзел у пасяджэннях раённага выканаўчага камітэта, у пасяджэннях камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва Салігорскага раёна, а таксама ў штомесячных маніторынгах цэн у магазінах горада. Нельга не сказаць аб правядзенні акцыі па добраўпарадкаванні «Пасадзім дрэва разам!», падчас правядзення якой былі высаджаны дрэвы на тэрыторыі сацыяльна-педагагічнага цэнтра Салігорскага раёна, дзе знаходзяцца дзеці, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі.

***— Нядаўна ў Салігорску праходзіла рэспубліканская акцыя «Марафон адзінства». Якія ўражанні засталіся ад ёй у горадзе?***

— Толькі станоўчыя! Гэта была ўнікальная магчымасць бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй і традыцыямі нашай краіны, больш даведацца пра беларускую самабытнасць і дасягненні. Гэта і канцэрты, і выстаўкі, і майстар-класы, і квэсты, і іншыя цікавыя мерапрыемствы. Маштабная акцыя завітала да нас у першыя дні новага года. Яна не пакінула жыхароў і гасцей горада абыякавымі. Гэта знакавая падзея для горада. Марафон аб'ядноўвае людзей розных пакаленняў, розных прафесій, якія ганарацца сваёй гісторыяй, вераць у будучыню краіны. Нам ёсць што захоўваць, што несці далей. Такія мерапрыемствы патрэбныя, каб мы маглі сабрацца разам і адчуць, што беларусы прыязныя і спагадлівыя. Беларусь — краіна магчымасцяў, дзе кожны чалавек, пачынаючы з самага юнага ўзросту, можа рэалізаваць сябе.

**Такое магчыма толькі ў дзяржаве, кіраўнік якой сапраўды бачыць свой галоўны клопат у тым, каб краіна развівалася і людзям у ёй жылося з кожным годам лепш.**

***— Якія мерапрыемствы з вашым удзелам праводзяцца ва ўмовах электаральнай кампаніі?***

— Актыўна праходзяць сустрэчы ў працоўных калектывах горада, пачас якіх абмяркоўваюцца пытанні аб асноўных кірунках дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, аб замацаванні і адаптацыі маладых спецыялістаў, аб павышэнні ўзроўню абслугоўвання насельніцтва, абмяркоўваюцца дасягненні Беларусі за апошнія 30 гадоў, а таксама аб ходзе выбарчай кампаніі.

Па дадзенай тэматыцы праводзіцца шмат мерапрыемстваў. Гэта і сустрэчы ў працоўных калектывах, і ўдзел у асветніцкіх мерапрыемствах і дыялогавых пляцоўках, і ўзаемадзеянне з выбарчымі камісіямі.

**Выбары Прэзідэнта — гэта важны перыяд для любой краіны, і ўдзел грамадзян у гэтым працэсе адыгрывае ключавую ролю ў фарміраванні будучыні. Галоўнае — памятаць, што ўдзел у выбарах — гэта не толькі правы, але і адказнасць. Голас кожнага з нас можа стаць вырашальным у вызначэнні будучыні Беларусі.**

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з архіва Алены ХАМІЦЭВІЧ.**

# «НЕ ПРОСТА ДАВЕДАЦЦА АБ ПРАБЛЕМЕ, А ПАСТАРАЦЦА РАСКРЫЦЬ УНУТРАНЫ БОЛЬ ЧАЛАВЕКА»

## Дэпутат Міхаіл МІРОНЧЫК — аб важных аспектах у рабоце з выбаршчыкамі

**Аб рабоце ў сваёй Каменнагорскай 102-й акрузе (горад Мінск) дэпутат Палаты прадстаўнікоў Міхаіл Мірончык расказвае так: «Яшчэ да пачатку работы нашага склікання я цалкам сышоў «у народ»: меў зносіны з працоўнымі калектывамі і кіраўнікамі, часам нават не афіцыйна, а ў рамках звычайнай гутаркі. Па сакрэце скажу, бывалі выпадкі, калі стараўся няўзнак завязаць размову з жыхарамі маёй акругі, як бы выпадкова, напрыклад, у краме. Так што, калі здарыўся момант самога «знаёмства», я быў ужо дасведчаны аб тым месцы, аб той акрузе і раёне, на карысць якой мне трэба будзе працаваць наступныя некалькі гадоў»...**



Міхаіл Уладзіміравіч як сапраўдны педагог, які вырас і сфарміраваў сваю асобу на базе савецкай педагагічнай школы, усё дасканала вывучыў, склаў выразны план «урока» і быў цалкам гатовы. Фрунзенскі раён, які ён прадстаўляе у Палаце прадстаўнікоў, з'яўляецца самым сацыяльным раёнам сталіцы. У раёне размешчана амаль 50 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, каля 100 — дашкольнай, таму работы, асабліва ў рамках дзейнасці яго камісіі, напярэдадне было шмат. Дэпутат пры гэтым усведамляў увесь маштаб і быў загадзя настроены на тое, што многія пытанні давядзецца адкрываць знoўку і паглыбляцца дадаткова ў вывучэнне заканадаўства, напрыклад, у сферу жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

***— Фрунзенскі раён — ці не самы густанаселены ў сталіцы... Якія праблемы хвалююць жыхароў вашай акругі?***

— У гэтым плане мне вельмі пашанцавала. Насельніцтва Фрунзенскага раёна горада Мінска гатова да зносін, настроена на канструктыўны дыялог. Самае галоўнае пры правядзенні прамых тэлефонных ліній або асабістых прыёмаў грамадзян — не проста даведацца аб праблеме, з якой звярнуўся грамадзянін, а пастарацца раскрыць яго ўнутраны боль і зразумець, чаму гэтая праблема ўзнікла. Кожны прыходзіць са сваёй гісторыяй, і важны складнік нашай работы — атрымаць шчырасць ад грамадзян, сумленнасць. Цікавай формай работы ў гэтым кірунку з'яўляюцца сумесныя прыёмы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і кіраўніцтва адміністрацыі раёна. Гэта дазваляе раскрыць праблему з кожнага боку і вырашыць яе, грунтуючыся не толькі на вопыце заканадаўчай ініцыятывы, але і «па-гаспадарску», адразу на ўзроўні кіруючага апарату.

З асноўных тэм зваротаў можна вылучыць бягучы і капітальны рамонт, адукацыю, жыллёва-камунальную гаспадарку, будаўніцтва арэнднага жылля і добраўпарадкаванне, а таксама пытанні, звязаныя са зменамі маршрутаў грамадскага транспарту — простыя і зразумелыя нашым грамадзянам рэчы, тое, што трэба для жыцця.

**Актуальнай тэмай выступала водазабеспячэнне ў нашым раёне, але сёння праблема вырашана, за што хочацца яшчэ раз сказаць дзякуй кіраўніцтву горада і асабіста Прэзідэнту ад імя жыхароў маёй Каменнагорскай выбарчай акругі.**

***— Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — гэта ідэалагічныя работнікі, асабліва ва ўмовах электаральнай кампаніі...***

— Тэма выбарчай кампаніі цяпер сапраўды адна з ключавых. Мы штодня робім выбар: што сёння надзець, якім чынам дабрацца на працоўнае месца і гэтак далей. Аднак у нашым жыцці ўзнікаюць сітуацыі, калі наш выбар можа паўплываць не толькі на тое, як пройдзе наш дзень, але і на будучыню цэлай дзяржавы. Я вельмі ганаруся, што ў дадзены момант у мяне і ў маіх калег ёсць магчымасць і нават неабходнасць быць тым, хто мае зносіны з людзьмі на тэму выбарчай кампаніі.

Мы стараемся данесці на сустрэчах з людзьмі, што прыйсці і аддаць свой голас — гэта важна! Дарослыя людзі гатовы да такіх размоў, яны ведаюць, што такое электаральная кампанія, і разумеюць усю важнасць маючай адбыцца падзеі.

**У рамках сваёй работы ў акрузе я імкнуся закрануць і тых, для каго гэта будуць першыя або адны з першых выбараў — моладзь. Важна, каб у гэты момант побач з моладдзю апынуўся чалавек, які растлумачыць ім усё простай і зразумелай мовай.**

Я педагог, мне блізка разуменне маладзёжнага асяроддзя і таго, якім чынам лепш выбудаваць дыялог з імі так, каб інфармацыя была пачутая і зразуметая. Так, напрыклад, мы правялі ўжо чатыры сустрэчы з навучэнцамі каледжаў горада Мінска ў рамках праекта Палаты прадстаўнікоў «Моладзь для Беларусі!» Цесна працую з Маладзёжным парламентам пры Нацыянальным сходзе па гэтым пытанні. Дзесьці трохі пазычаю ў іх ідэі і «фішкі», дзесьці стараюся даць невялікую параду. Зноў жа — звычка педагога...

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з архіва Міхаіла МІРОНЧЫКА.**

# ПАШАНА — ПА ПРАЦЫ

## Брэстчына пабагацела ганаровымі грамадзянамі



Фота БелТА.

**РАШЭННЕМ пазачарговай сесіі Брэсцкага абласнога Савета званне «Ганаровы грамадзянін Брэсцкай вобласці» нададзена пяці асобам. Раней гэтага звання былі ўдастоены 14 заслужаных людзей рэгіёна. Цяпер да ганаровага спіса далучыліся прозвішчы Канстанціна Сумара, Аляксандра Карпіцкага, Аляксандра Саўчыца, Сцяпана Халько і Уладзіміра Храленкі.**

**Канстанцін СУМАР узначальваў Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт у 2004—2014 гадах.** Да гэтага займаў пасады намесніка начальніка службы кантролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, намесніка старшыні Камітэта Дзяржкантролю, першага намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама, міністра па падатках і зборах краіны. А яшчэ раней узначальваў калгас у Лунінецкім раёне, працаваў старшынёй Лунінецкага райсавета, потым — старшынёй Брэсцкага раённага Савета і старшынёй Брэсцкага райвыканкама. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўную доблесць».

**Аляксандр КАРПІЦКІ, галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.** Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар 15 вынаходстваў, мае 288 надрукаваных навуковых работ у айчынных і замежных выданнях. Брэсцкую абласную бальніцу ўзначальвае 24 гады. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», шэрагам ганаровых грамат.

**Аляксандр САЎЧЫЦ, генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт»,** кіруе прадпрыемствам, якое з'яўляецца лідарам малочнай галіны Рэспублікі Беларусь. Вытворчасць вядзецца на дзевяці пляцоўках — сучасных высокатэхналагічных заводах.Мае званне «Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь», узнагароджаны ордэнамі Айчыны III і II ступені. Неаднаразова станавіўся «Чалавекам года», «Найлепшым кіраўніком года» ў Брэсце. У 2013 годзе было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Брэста».

> Відаць, самая вялікая ўзнагарода ў маім жыцці — прызнанне брастаўчан, — сказаў журналістам Аляксандр Карпіцкі. — Як і любому чалавеку, мне прыемна, калі так ацэньваюць маю работу. Праца, якую люблю, і дапамагла атрымаць гэтае высокае званне. У нас яшчэ шмат задач.

**Сцяпан ХАЛЬКО, дырэктар УП «Маладава-Агра» Іванаўскага раёна,** адной з найлепшых гаспадарак па развіцці жывёлагадоўлі ў краіне. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі краіны, узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». «Чалавекам года Брэстчыны» станавіўся тройчы. З 2016 года з'яўляецца Ганаровым грамадзянінам г. Іванава і Іванаўскага раёна.

**Уладзімір ХРАЛЕНКА, дырэктар ААТ «Парахонскае»,** вядомага сельгаспрадпрыемства ў вобласці і краіне, узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», шэрагам ганаровых грамат. Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін Пінскага раёна».

Віншавалі новых ганаровых грамадзян падчас святкавання 85-годдзя Брэсцкай вобласці. **Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК** уручыў ім адпаведныя сертыфікаты.

«Відаць, самая вялікая ўзнагарода ў маім жыцці — прызнанне брастаўчан, — сказаў журналістам Аляксандр Карпіцкі. — Як і любому чалавеку, мне прыемна, калі так ацэньваюць маю работу. Праца, якую люблю, і дапамагла атрымаць гэтае высокае званне. У нас яшчэ шмат задач».

У Брэсцкай абласной бальніцы ўзводзіцца новы корпус, і на гэтым развіццё медыцынскай установы не спыніцца. Работа па паляпшэнні якасці, даступнасці медыцынскай дапамогі будзе працягвацца.

Аляксандр Саўчыц гаварыў аб тым, што вельмі ўдзячны свайму калектыву: «У нас працуе восем з паловай тысяч чалавек. Гэта і іх праца сёння адзначана. У 1998 годзе, калі ўзначаліў камбінат, мы перапрацоўвалі 70 тон малака, цяпер атрымліваем прадукцыю з 5,1 тысячы тон сыравіны».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ООО «Гастон Восток», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 165а

| № лота | Инв. номер | Предмет аукциона | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 500/D-693240 | **Подземный торговый зал над станцией метро «Партизанская»** (торговое помещение) общей площадью 2564,4 кв. м, по адресу: г. Минск, Подземные переходы, 3-6 | 8 247 747,00 (снижена на 50 %) | 412 387,35 |

**Обременение: аренда.** Подробная информация на сайте организатора аукциона

| № лота | Инв. номер | Предмет аукциона | Начальная цена без НДС, бел. руб. (снижена на 10 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2 | 500/D-693237 | **Торговое помещение № 3** общей площадью 62,3 кв. м, по адресу: г. Минск, Подземные переходы, 3-3 | 375 829,20 | 18791,46 |
| 3 | 500/D-693236 | **Торговое помещение № 2** общей площадью 51,0 кв. м, по адресу: г. Минск, Подземные переходы, 3-2 | 307 879,20 | 15393,96 |
| 4 | 500/D-693239 | **Торговое помещение,** общей площадью 40,3 кв. м, по адресу: г. Минск, Подземные переходы, 3-5 | 240 801,30 | 12040,07 |

**Обременение: аренда.** Подробная информация на сайте организатора аукциона

| № лота | Предмет аукциона | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 5 | **Имущественные права (требования по передаче в собственность)** по договору от 01.12.2020 № 1/12-20, заключенного между ООО «Гастон Восток» и ООО «Бизнес ФМ», долевого строительства помещения общей площадью 1440 квадратных метров в Объекте «Реконструкция незавершенного строительством производственного корпуса по ул. З. Бядули, 13 под административное здание с помещениями общественного назначения». Подробная информация на сайте организатора аукциона ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by) | 2 061 000 долл. США* (снижена на 10 %) | 103 050 долл. США |

**(Цена продажи предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения торгов)*

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **03.02.2025** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка».** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **31.01.2025** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Шуляк Артур Леонидович, тел. 8029-123-39-49

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайтах организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 % (по лотам №№ 1–4) и задаток 1 % (по лоту № 5)** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (1–4 % от цены продажи (подробная информация в карточке лота на сайте организатора торгов) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

*Предыдущее извещение по лотам №№ 1–4 опубликовано в газете «Звязда» от 16.11.2024 г., по лоту № 5 в газете «Звязда» от 28.11.2024 г.*

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.830. Нумар падпісаны ў 19.30 14 студзеня 2024 года.**

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении **27 января 2025 года в 15.00** повторных аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего
## РУП «Торговый дом «Восточный»

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708179937, общей площадью 2878,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, тр-т Игуменский, 16-388 (наименование и назначение – торговое помещение), и установленные в нём системы и оборудование: система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре с инвентарным номером 2748, система водяного пожаротушения и система автоматизации с инвентарным номером 2749, система охранной сигнализации с инвентарным номером 2751, система контроля доступа с инвентарным номером 2753, система холодоснабжения с инвентарным номером 2756 | |
| **Начальная цена** – 6 976 770,89 бел. руб. с учетом НДС | **Размер задатка** – 697 677,09 бел. руб. |
